28.08.2019
Звязда

# Факсімільнае выданне Берасцейскай Бібліі перададуць Брэсту

**Самая вялікая ў гісторыі айчыннага друку, самая дарагая і, на думку некаторых даследчыкаў, самая загадкавая. Знакамітую Берасцейскую Біблію, якая была надрукавана на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага ў 1563 годзе, спецыялісты характарызуюць добрым дзясяткам эпітэтаў «самая» і «першая». На жаль, сёння ў нашай краіне захоўваецца толькі пяць асобнікаў унікальнай кнігі (два ў дзяржаўных установах, тры − у прыватных калекцыях), і ніводны з іх не поўны.**




Аднак сёлета да 1000-годдзя Брэста Нацыянальная бібліятэка Беларусі сумесна з кампаніяй «Белнафтастрах» зрабіла землякам шыкоўны і ва ўсіх сэнсах каштоўны падарунак − факсімільнае выданне Берасцейскай Бібліі. Аб'ём яе складае амаль паўтары тысячы старонак, упрыгожаных шматлікімі гравюрамі, вага дасягае 15 кілаграмаў. Пераплёт і вокладку выдання, ад металічных засцежак да стужкі-закладкі лясэ, рабілі цалкам уручную па старажытных тэхналогіях. Факсіміле, як адзначае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, каардынатар і навуковы кіраўнік выдання Алесь СУША,** перадае ўсе ўласцівасці арыгіналу − асаблівую паперу, характар друку, рукапісныя каментарыі і нават пазнейшыя бібліятэчныя штампы. Асновай для

факсіміле, дарэчы, стаў асобнік, які захоўваецца ў Таруньскай бібліятэцы − некалі ён належаў сям'і вядомага культурнага дзеяча ВКЛ Багуслава Радзівіла.

10 асобнікаў узноўленай Біблії будуць перададзеныя ў падарунак Брэсту падчас урачыстасцяў з нагоды 1000-гадовага юбілею. Таксама плануецца прадставіць факсімільнае выданне шырокай publіцы ў Мінску і іншых гарадах, у тым ліку за межамі нашай краіны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**